Издатель УП «Газета Слонимская» Выходит один раз в неделю

Просто хорошая газета

Газета рекламная для досуга
Основана 18 октября 2002 года
№46 (689) 15 ноября 2017 года

12+

Отдушина



АЛЛО, МЫ СЛУШАЕМ ВАС

Отказали в просьбе проводить ветерана в последний путь

На днях в редакцию позвонила слонимчанка Людмила Викторовна, которая рассказала неприятную историю.

— Недавно проводили в последний путь свою коллегу Людмилу Павловну Мороз, с которой мы много лет проработали на камвольно-прядильной фабрике. Так вот, после отпевания супруг покойной позвонил на предприятие и попросил, чтобы предоставили автобус отвезти ее на кладбище. Но ему в просьбе отказали. Мы все были настолько возмущены, что не можем до сих пор прийти в себя: обида и боль терзают душу. Ведь мы на фабрику пришли работать совсем юными, когда только закручивали болты на станках, и проработали до пенсии. Почти вся жизнь прошла на предприятии. Так неужели она не заслужила, чтобы ее провели в последний путь? Это просто кощунство по отношению к нам, ветеранам предприятия. Обидно, что нас, пенсионеров, всегда обходят стороной. За все время никогда даже открыткой на профессиональный праздник не поздравили. Более того, мы являемся акционерами предприятия, но ни разу не получали дивиденды.

Я вас прошу, пожалуйста, напишите об этом, чтобы люди в трудную минуту надеялись на себя, так как фабрика им не поможет, — рассказывала сквозь слезы эту историю женщина.

Я связалась с супругом покойной Николаем Морозом, который подтвердил, что такой факт имел место быть.

— Моя дочь позвонила на камвольную фабрику в профсоюзную организацию и в отдел кадров с просьбой предоставить автобус на похороны супруги, но ей отказали, сказали, что нет автобуса. Обидно. Жена на фабрике отработала тридцать лет, и я трудился около двадцати лет. Но, видимо, не заслужили уважения. Пришлось дочери звонить на мясокомбинат, где она сейчас работает. Там сразу же выделили транспорт, за что им огромное спасибо, — сказал Николай Мороз.

Конечно, право руководителя — выполнить просьбу бывшего работника или нет. И все же я попыталась выяснить, почему на фабрике проигнорировали просьбу предоставить автобус на похороны, позвонив в отдел кадров.




— Те, кто работал на фабрике и ушел от нас на пенсию — очень добросовестные, ответственные и исполнительные работники. Ни об одном не могу сказать плохого слова, все работали хорошо.

— А почему тогда отказали предоставить автобус на похороны бывшей работницы?

— У нас автобус на сегодняшний день испорчен, не на ходу, он не прошел техосмотр. Возможно, по этой причине могли отказать. А так всем нашим пенсионерам, которые к нам обращаются, оказываем материальную помощь согласно коллективному договору. И транспорт выделяем, если он у нас на ходу, и людей выделяем на случай, если помощь нужна. Ни одному человеку мы еще не отказали, — прокомментировала ситуацию начальник отдела кадров Слонимской КПФ.

Анна ВОЛОДАЩУК
ANNA@GS.BY

ІНТЭРВ'Ю



Міхась Скобла

«Кастусь Каліноўскі раскідваў па слонімскіх дарогах перад паўстаннем 1863 года «Мужыцкую праўду»

У Слоніме 14 лістапада гасціў вядомы на Беларусі пісьменнік, гісторык і журналіст Міхась Скобла.

Напачатку госць правёў сустрэчу з вучнямі сярэдняй школы №4, дзе расказваў дзецям і маладзёнам пра гісторыю Беларусі. А пасля спадар Міхась сустрэўся са слонімскімі грамадскімі актывістамі і прэзентаваў кнігу «Выспятак ад Скарыны», якая выйшла з друку ў серыі «Бібліятэка Свабоды» Радыё Свабода. Таксама пан Міхась адказаў на пытанні карэспандэнта «ГС». Падчас размовы ён успомніў і пра свой родны Дзярэчын, і пра Сапегаў, і іншае.

— Пан Міхал, Вы самі родам з Дзярэчына, ці часта бываеце на малой радзіме?

— Часта. Як пісаў паважаны Рыгор Барадулін, «Трэба дома бываць часцей, трэба дома бываць не госцем...». Тым больш у Дзярэчыне ў маёй роднай хаце дагэтуль жыве мая 86-гадовая мама.

— І ў Слоніме бываеце, значыць, нярэдка?

— Ну, дарога на малую радзіму ў мяне ляжыць праз Слонім, і яго не аб`едзеш. *(Смяецца.)* І вельмі прыемна, што праз Слонім ты праязджаеш беларускую гісторыю. Тут і Сапегі, тут і Агінскія, тут і паўстанцы, тут і Міхал Валовіч, тут і Кастусь Каліноўскі раскідваў па слонімскіх дарогах перад паўстаннем 1863 «Мужыцкую праўду». Тут шмат чаго.

— Вы сёння ў школе расказвалі пра Сапегаў. Ці няма для гэткіх сустрэч у школах перашкод з боку ўладаў?

— Так, сёння расказваў і прэзентаваў кнігу пра Сапегаў і ў Дзятлаве, і ў Слоніме. Таму што гэта сапегаўскія гарады. У Дзятлаве, напрыклад, дагэтуль стаіць касцёл, зафундаваны сынам Льва Сапегі Казімірам. А ў Слоніме Леў Сапега 47 гадоў быў старастам, тут ёсць яго плошча, спадзяюся, хутка будзе і помнік яму. А наконт забаронаў, то розныя бываюць дырэктары школ, загадчыкі аддзелаў адукацыі. Па-рознаму бывае. Напрыклад, у тым месяцы адмянілі сустрэчу на Лідчыне. Але трэба ісці да людзей з новымі кніжкамі, з новымі творамі, асабліва да дзяцей, якія пасля выступаў кажуць мне «дзякуй». І, нягледзячы на ўсе перашкоды, мы дойдзем да той мэты, да якой ідзем.

— А як Вы ацэніце сучасную беларускую культуру і моладзь? Такія тэндэнцыі, калі, напрыклад, у Мінску на самай тусовачнай вуліцы Зыбіцкай хіпстары і іншая прасунутая моладзь пачынае размаўляць па-беларуску? На гэта ёсць трэнд?

— Тэндэнцыя ёсць, і я аптыміст. Я бачу ўсё гэта і бачу, як, напрыклад, па краіне імкліва распаўсюджваюцца курсы «Мова Нанова».

Мікіта ПАСТУХОЎ
ФОТА АЎТАРА
N.PASTYHOW@GMAIL.COM

Конкурс «Отличник» продолжается

Прошлый конкурс прошел познавательно и весело, и мы решили продолжить его проведение. Ждем активных и целеустремленных ребят!

С нами учиться веселее!

Публичный конкурс проводится для достижения важной и общественно полезной цели: стимулирования успеваемости учеников Слонимского района.

В конкурсе смогут принять участие ученики 5-11-х классов Слонимского района.

Для того чтобы принять участие в конкурсе, необходимо:

— вырезать купон с пометкой «Конкурс «Отличник», который будет размещаться в каждом номере «Газеты Слонимской»;

— отметить в купоне количество 9 и 10, полученных учеником за текущую учебную неделю, а также указать ФИО учащегося, класс, школу, мобильный телефон родителя для связи, подпись родителя;

— прислать или принести купон в редакцию «Газеты Слонимской» по адресу:

231800, г. Слоним, ул. Красноармейская, 41.

На купоне указаны даты учебной недели, за которую должны быть внесены оценки. При подведении итогов оценки суммируются со всех купонов, присланных одним участником. В конкурсе участвуют только оригинальные, вырезанные из газеты купоны, копии купонов не принимаются.

8 участников, которые по итогам конкурса наберут наибольшее количество баллов, получат ***сертификат на сумму 50 рублей на посещение кафе «Пятачок» по адресу ул. Красноармейская, 8а***.

Срок проведения конкурса: с 22 ноября 2017 г. по 23 декабря 2017 г.

Купоны принимаются до 29 декабря 2017 г. включительно.

Результаты конкурса будут опубликованы в «Газете Слонимской» 3 января 2018 года.

Приз победителю будет вручен представителем «Газеты Слонимской» в редакции «Газеты Слонимской» с 3 января 2018 г. по 7 января 2018 г. при обращении победителя в редакцию (г. Слоним, ул. Красноармейская, 41).

ВАЖНО! Победителями конкурса станут 8 участников, которые наберут в сумме больше всего баллов. В случае если участников с одинаковым наивысшим количеством баллов окажется больше 8, то приз будет разделен между победителями в равных долях.

Заполняя и подписывая купон, законные представители несовершеннолетнего участника дают согласие на сбор, обработку и хранение персональных данных участников и своих персональных данных для целей проведения настоящего конкурса.

Правила проведения Конкурса «Отличник» читайте также на сайте «Газеты Слонимской» www.gs.by.

ВАЖНО! Организаторы имеют право потребовать дневник участника для сверки присланных и полученных в школе оценок.

ВЫРЕЖИ МЕНЯ

Купон

конкурс «Отличник» Газета Слонимская

ФИО участника

Школа, класс участника

Количество 9 и 10, полученных участником за текущую неделю

Мобильный телефон родителя(ей) для связи
+375 ( ) ____________

(20-25 ноября)
Дата учебной недели, за которую должны быть внесены оценки

Подпись родителя

ВЫРЕЖИ МЕНЯ

По вопросам обращаться по телефонам: 8-029-118-80-60, 2-90-00, по электронной почте: salejko2013@mail.ru либо в редакцию «Газеты Слонимской» по адресу: г. Слоним, ул. Красноармейская, 41.

Анастасия САЛЕЙКО

Готовим вкусно вместе с шеф-поваром кафе «Оазис»

ДАВАЙТЕ СОСТАВЛЯТЬ НОВОГОДНЕЕ МЕНЮ ВМЕСТЕ!

Именно с этой целью — найти что-то нетривиальное для новогоднего стола — мы отправились к шеф-повару кафе «Оазис» Владимиру Бабунову. Владимир поделился парочкой рецептов потрясающих блюд, одно из которых — «Перепелка по-фермерски с овощами», новое блюдо в кафе «Оазис».

До Нового года еще больше месяца, но некоторые приготовления уже идут полным ходом. Запастись подарками, подобрать наряд, но, главное, придумать, какими кулинарными изысками удивить гостей. К тому же в такой праздник хочется побаловать себя чем-то особенным!

«ПЕРЕПЕЛКА ПО-ФЕРМЕРСКИ»

Ингредиенты на 1 порцию:
Перепелка — 1 шт.
Соевый соус — 1 ч. л.
Мед — 1 ч. л.
Смесь приправ (молотый черный и душистый перец, паприка, соль)

Для гарнира:
Баклажан — 50 г
Помидор — 50 г
Чеснок — ползубка
Кетчуп, растительное масло



Способ приготовления:

Для начала подготовим перепелку.

— Раскрою небольшой секрет, — рассказывает Владимир, — для того чтобы быстрее приготовить любую птицу, прежде чем мариновать и ставить в духовку, ее нужно немного подварить. Для перепелки будет достаточно 5 минут.

Пока наша птичка томится в воде, мы подготовим соус, в котором будем ее мариновать. Для этого нам понадобится по чайной ложке меда и соевого соуса. Выкладываем все в одну посуду и размешиваем. Туда же добавляем подготовленную смесь приправ. Смазываем хорошенько подварившуюся тушку и оставляем в солено-сладко-пряном соусе на 10-15 минут. Пока перепелка маринуется, займемся подготовкой гарнира, который состоит из баклажана и помидора.

Баклажан нарезаем небольшими брусочками, чтобы кусочки не были слишком большими, но достаточно быстро прожарились. Выкладываем на разогретую сковороду и обжариваем.

— При обжарке баклажан впитывает много масла, поэтому его лучше добавлять понемногу, — советует Владимир.

Через пару минут забрасываем помидор, нарезанный по той же системе. Для усиления вкуса добавим к овощам чеснок. На одну порцию ползубка будет достаточно. Заливаем все это кетчупом и томим на небольшом огне еще несколько минут. Острый, но мягкий гарнир будет немного контрастировать со сладковатым мясом перепелки и придаст ему особый вкусовой оттенок.

Пока гарнир доходит, завершим приготовление перепелки. Еще раз смазываем ее соусом и ставим в уже разогретую при 180 градусах духовку. 10 минут для маленькой перепелки будет достаточно — главное, не пересушить ее. Для любой птицы не рекомендуется температура выше 180 градусов.

Перепелка готова!

САЛАТ «БАГАЧ»

Ингредиенты на 1 порцию:
Баклажан — 80 г (60 г в обжаренном виде)
Помидор — 50 г
Соленая семга — 40 г
Перепелиное яйцо, вареное
Масло оливковое, бальзамический уксус, специи и сок лимона. Перец, хмели-сунели, сушеный базилик или укроп

Способ приготовления:



Баклажан нарезаем небольшими брусочками, чтобы легко обжарить, и кладем на разогретую сковороду. Добавляем немного соли и масла.

— После того как обжарите баклажан, выложите его на тарелку, чтобы масло немного стекло, — советует Владимир.

Пока баклажаны доходят, мы нарезаем помидоры полукольцами и выкладываем на тарелку. На помидоры горочкой кладем баклажаны и сверху семгу.

Рыбу не стоит нарезать слишком мелко, кусочки должны быть примерно 1 см в диаметре, чтобы можно было хорошо прочувствовать вкус.

Получившуюся горочку поливаем приготовленным соусом. Для соуса нам нужно смешать немного оливкового масла, бальзамический уксус, сок лимона по вкусу и специи. Специи лучше выбрать мягкие, не острые, поскольку вкус этой рыбы вполне самодостаточен. Мы выбираем немного перца, хмели-сунели, сушеный укроп или базилик для запаха.

Также в салат можно добавить немного майонеза. Украшаем разрезанным на две половинки перепелиным яйцом и зеленью.

Блюдо готово!

Анастасия САЛЕЙКО

Футбольные трибуны — это лакмусовая бумажка процессов, происходящих в обществе. Полупустой стадион — первый признак разобщённости.
Владимир Хотиненко




ФК «Слонім–2017» узору 2017 года разам з заўзятарамі

17 фактаў пра ФК «Слонім-2017» у 2017 годзе

1. Новая назва года

Футбольны клуб «Слонім» у пачатку 2017-га быў рэарганізаваны ў дзяржаўную спартыўную ўстанову «Футбольны клуб «Слонім-2017».



Новым уладальнікам клуба стаў Слонімскі раённы выканаўчы камітэт.

Нагадаем, што слонімскія футбольныя заўзятары хочуць вярнуць клубу старую назву «Камунальнік». Так клуб называўся з 1996 да 2013 года.

2. Адстаўка года



18 жніўня нечакана пасаду галоўнага трэнера ФК «Слонім-2017» пакінуў Вячаслаў Царук, пад кіраўніцтвам якога клуб набраў нядрэнны ход і некаторы час знаходзіўся ў кагорце прэтэндэнтаў на выхад у вышэйшую лігу.

3. Кароль года



Новым галоўным трэнерам быў прызначаны вядомы ў мінулым футбаліст Алег Кароль. Адназначым, што за сваю кар`еру Кароль гуляў у еўрапейскіх чэмпіянатах, а таксама ў барысаўскім БАТЭ.

4. Траўма года



8 кастрычніка падчас матча з пераможцам першай лігі мінскім «Праменем» цяжкую траўму, спрабуючы забіць гол, атрымаў лепшы футбаліст Слонімшчыны-2016 Аляксандр Пузач. На поле па яго прыехала «хуткая дапамога».

5. Разгром года

Восем прапушчаных мячоў ад аўтсайдэра першай лігі ФК «Смаргонь» зрабілі той матч для слонімцаў самым жудасным у сезоне. Гэта было поўнае фіяска.

6. Выезд года

Гэта выезд больш чым двух дзясяткаў слонімскіх футбольных фанатаў у ніяблізкі Бабруйск на матч з «Белшынай». Зазначым, што фан-клубы камандаў маюць даўнія няпростыя адносіны паміж сабой.

7. Заўзятар года



Тут першынстве 10-гадовы Захар Белякоў. Хлопчык у падрабязнасцях можа расказаць моманты гульняў любімага клуба, а таксама, у адрозненне ад дарослых, не лічыць каманду безнадзейнай. З трох гадоў юны слонімец наведвае ўсе гульні ФК «Слонім».

8. Джыгіт года

Адным з самых яркіх навабранцаў, якія прыйшлі перад сезонам-2017, стаў няўступлівы флангавы гулец Георгій Чытанава. Георгій люта змагаўся за мяч у кожным матчы і стаў практычна незаменным гульцом у камандзе. Магчыма, адна з прычын няўступлівасці і байцоўскіх якасцяў Чытанавы — яго грузінскія карані.

9. Бамбардзір года

У ФК «Слонім-2017» востры дэфіцыт забіўных форвардаў. Таму лепшым бамбардзірам каманды з шасцю забітымі мячамі стаў паўабаронца Павел Міхальцоў.

10. Перамога года

Несумненна, тут варта адзначыць хатнюю перамогу над лідарам на той час турнірнай табліцы «Смалявічамі-СТІ» з лікам 1:0.

11. Торт года



Добра ў сезоне працавала маркетынгавая служба клуба, і ў перапынку таймаў на хатніх гульнях былі разыграны разнастайныя прызы — для прыкладу, сплаў па Ісе на байдарцы, паездка на футбол у Бабруйск, мяч з аўтографамі футбалістаў ФК «Слонім-2017» і выдатны торт Слонімскага хлебазавода.

12. 12-ы гулец года

Тут трэба адзначыць слонімскіх футбольных фанатаў, якія заўсёды аддана падтрымлівалі каманду, нягледзячы на надвор`е і на тое, перамагае яна ці прайграе. Як адзначалі госці з іншых гарадоў, у Слоніме адзін з лепшых фан-сектараў ва ўсёй першай лізе. Таксама менавіта футбольныя фанаты з`яўляюцца шчырымі патрыётамі Беларусі і падтрымліваюць беларускую мову ў футбольнай і каляфутбольнай сферы.

13. Зборнікі года

Наўпрост з ФК «Слонім-2017» ніхто не выклікаўся, але Раман Козел, які перайшоў летам са слонімскай каманды ў менскія «Крумкачы», восенню быў выкліканы ў маладзёжную зборную Беларусі. У гэтым немалую ролю адыграла першая палова сезону, стабільна згуляная ў Слоніме. Таксама летам у «Слонім-2017» з жодзінскага «Тарпеда» перайшоў былы гулец моладзевай зборнай краіны Андрэй Салавей.

14. Парушальнік года

Капітан, вядучы абаронца і адзін з лідараў «Слонім-2017» — Анатоль Жукаў — стаў і галоўны парушальнікам сезону. Пасля выдалення ў хатнім матчы з «Баранавічамі» футбаліст прапусціў ажно 6 матчаў, што вельмі паўплывала на гульні і абарону слонімцаў. Таксама ў пачатку сезона ён атрымаў 5-матчавую дыскваліфікацыю пасля матчу з "Хімікам".

15. Незразумелая сітуацыя года

Пасля выхаду ў свет «Газеты Слонімскай» №33, дзе быў апублікаваны матэрыял аб адстаўцы Вячаслава Царука з пасады галоўнага трэнера ФК «Слонім-2017», паўстала незразумелая сітуацыя. Растлумачыў яе старшыня Слонімскага райвыканкама Алег Таргонскі: «Што тычыцца зыходу Вячаслава Царука, то мы, лічу, нармальна развіталіся з ім, сказалі яму дзякуй. Яго трэба таксама зразумець — у чалавека паўсталі свае сямейныя абставіны».

16. Госця года



12 жніўня вядомая ў Беларусі тэлевядучая Крысціна Козел («Козел пра футбол») наведала разам са здымачнай групай матч чэмпіянату Беларусі па футболе ў першай лізе паміж «Слонімам-2017» і гомельскім «Лакаматывам».

17. Лідарства года

У 2017 годзе ФК «Слонім-2017» упарта вырваўся наперад і трываў лідарства па наведвальнасці сярод каманд першай лігі чэмпіянату Беларусі.

Мікіта ПАСТУХОЎ
ФОТА З АРХІВА «ГС»







ВОЙДИ В ИСТОРИЮ СВОЕГО ГОРОДА

В жизни каждого человека случаются как радостные, так и горестные события. Ведь именно из них и складывается хроника нашей жизни, которая может быть интересна не только нам, но и нашим потомкам. Поэтому давайте вместе создавать историю нашего Слонима.

Если вы хотите, чтобы издание «Отдушина» написало о вашей свадьбе, рождении ребенка, известило о смерти ближнего и напечатало некролог под рубрикой "Войди в историю своего города", пишите нам -по адресу:
г. Слоним, ул. Красноармейская, 41, Тел.: 612-26-43, 2-90-00 (Тел/факс) .

Иван Климов: «Я хочу, чтобы мир был добрым»

Ваня пришел в этот мир с врожденной патологией: у мальчика редчайший TAR-синдром, при котором снижены тромбоциты и отсутствуют лучевые кости на обеих руках. Смириться с диагнозом и опускать руки мама Вани, Татьяна, не собиралась. Она прилагала все усилия, чтобы ее сыночек смог адаптироваться к внешнему миру и обществу, чтобы в его жизни было как можно меньше ограничений.

Для благотворительных целей в банке открыт расчетный счет BY57AKBB31340000048024120072, Беларусбанк, код AKBBBY21402, филиал 402.
Тел.: 8029 389 88 75 Vel., 8033 688 36 50 МТС (Татьяна)


Татьяна Климова с сыном Ваней

Первую операцию Ване сделали в Минске, но, к сожалению, неудачно. Вторая операция была проведена тоже в Беларуси. Находясь в республиканской клинике, Татьяна случайно узнала, что такие операции успешно делают в научно-исследовательском детском ортопедическом институте имени Г.И. Турнера в Санкт-Петербурге. Она отправилась в клинику на консультацию, где врачи дали надежду. Лечение должно было проходить в несколько этапов, для чего требовались немалые деньги.

Татьяна воспитывает Ванюшу одна, поэтому она обратилась в благотворительный фонд помощи детям «Шанс», который согласился оказать помощь для проведения операции и нахождения в российской клинике. Операция прошла успешно, но этого было недостаточно: для полноценной жизнедеятельности ребенка необходимо было сделать еще несколько операций. В общей сложности этот маленький мальчик перенес уже семь операций. Одна операция в российской клинике обходилась, по словам Татьяны, в более чем 120 тысяч российских рублей. К сбору денежных средств подключились слонимские организации, школы, не безучастным остался и белорусский певец Иван Володько, который своими благотворительными концертами помог не одному больному ребенку.

Сейчас Ваня ходит в первый класс, он очень активный и любознательный мальчик. На днях он с мамой побывал в гостях у «Газеты Слонимской».

Первое, что бросилось в глаза, это его ручки, на которых оставили следы многочисленные швы.

— Я все сам умею делать, — с ходу произносит Ваня.

— А что тебе больше всего нравится делать?

— Я люблю собирать пазлы, из «Лего» конструирую разные машинки, полицейских, еще мне нравится рисовать, лепить.

— Он все старается делать сам: обувается и одевается, рисует, пишет, правда, писать получается с трудом, и пуговицы пока сам не может застегивать, а так со всем он справляется сам, — поясняет мама.

— Ваня, о чем ты больше всего мечтаешь?

— Хочу, чтобы мир был счастлив.

— Почему именно миру желаешь счастья?

— Хочу, чтобы мир был добрым. А когда вырасту, хочу стать ветеринаром, лечить животных.

— Ваня всем старается помочь. Когда ходил в садик, защищал детей. С ним в детский сад ходил мальчик, у которого были проблемы со слухом, так Ваня всячески старался его опекать. Он очень добрый мальчик, — говорит Татьяна.

Любимый предмет у Вани в школе — математика.

— Мне нравится решать примеры, — подмечает Ваня.

Татьяна очень благодарна и признательна всем людям, которые не остались безучастными к их беде.

— Мы очень благодарны всем, кто отозвался на нашу просьбу помочь Ване. Очень много людей приняли участие в благотворительной акции. Мы даже не ожидали, что столько людей откликнется и поможет нам. Я поняла, что людей хороших очень много, особенно среди простых людей.

Всем огромное спасибо и низкий материнский поклон.

Значительные улучшения у Вани есть, он много чего научился делать сам, но для дальнейшей реабилитации и для того, чтобы Ваня мог полноценно жить в обществе, необходимо приобрести турник, для чего тоже необходимы дополнительные деньги.

Анна ВОЛОДАЩУК,
anna@gs.by
ФОТО АВТОРА

ФОТОКОНКУРС

«Мои любимые бабуля и дедуля»

Уважаемые читатели, напоминаем, что газета «Отдушина» проводит фотоконкурс «Мои любимые бабуля и дедуля», который будет проходить с 25 октября по 27 декабря 2017 года.





Для участия в конкурсе необходимо прислать фотографию, на которой запечатлены ваши бабушки и дедушки. Фотографию сопроводите кратким описанием того, кто изображен, расскажите, как вам дорог этот человек.

От одного участника принимается только одна фотография. Ваши фотографии будут опубликованы в газете «Отдушина» и размещены на страничке «ВКонтакте» в альбоме «Фотоконкурс «Мои любимые бабуля и дедуля»».

28 декабря будет проходить голосование в соцсети «ВКонтакте». Проголосовать за понравившееся фото можно будет, поставив отметку «Нравится» (лайк) под фотографией.

Победителем конкурса станет тот участник, чьё фото наберет больше всего голосов. Победителя ждет приз — скамья для прихожей, которую предоставит ЧУПП «Анмикс».

Фотографии присылайте по адресу: г. Слоним, ул. Красноармейская, 41, с пометкой «Фотоконкурс», или на эл. ящик: anna@gs.by

Желаем всем удачи!

Редакция газеты



Страницу подготовила Анна ВОЛОДАЩУК

ГЭТЫ ТЫДЗЕНЬ У ГІСТОРЫІ СЛОНІМШЧЫНЫ:
20-26 лістапада

21 лістапада 1555 года

Вялікім князем Літоўскім Жыгімонтам Аўгустам у Слоніме быў уведзены земскі суд, які займаўся разбіральніцтвам спраў шляхты.

21 лістапада 1983 года

У Слоніме нарадзіўся вядомы дудар Яўген Барышнікаў.

21 лістапада 1947 года

Ваенны трыбунал войскаў МУС Беларускай акругі і Мінска асудзіў удзельніка беларускага вызваленчага руху Васіля Супруна на 25 гадоў пазбаўлення волі і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці — за здраду Радзіме і антысавецкую агітацыю. Пасля вызвалення Васіль Супрун заняўся археалогіяй і працаваў настаўнікам. Аўтар шэрагу прац па гісторыі Слоніма.

23 лістапада 1556 года

Узгадваецца маёнтак Міромін Слонімскага павета (сёння вёска Міронім Івацэвіцкага раёна), за ўладанне якім спрачаліся Ганна Віктарынавая і княгіня Адынцэвічава.

25 лістапада 1937 года

Да расстрэлу быў прыгавораны Ігнат Дварчанін, вядомы дзеяч беларускага нацыянальнага руху, педагог, вучоны, паэт, перакладчык. Нарадзіўся ў 1895 годзе ў вёсцы Погіры Слонімскага раёна. Расстраляны 8 снежня 1937 года. У кастрычніку 1989 года ў цэнтры Дзятлава яму быў адкрыты помнік.

26 лістапада 1935 года

У СССР быў арыштаваны ўраджэнец вёскі Еднач Слонімскага павета Павел Крынчык (1898-1975), актыўны дзеяч вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі супраць польскага панавання, актывіст Таварыства беларускай школы. Падстава — «сувязь з разведкай буржуазнай Польшчы», у якой ён у 1930 годзе быў асуджаны на 6 гадоў, але ў выніку абмену палітвязнямі перабраўся ў Мінск. Аднак на волі правеў нядоўга. На радзіму вярнуўся толькі ў 1956 годзе.

Васіль ГЕРАСІМЧЫК

АФІША

Цэнтр культуры і адпачынку, кіназала

Серада, 22 лістапада
«Маленькі вампір» 3D (Нідэрланды, 2017, 6+, мультфільм, 1 г. 23 мін.), пачатак у 12.00, 13.30, 15.00
«Тор 3: Рагнарок» 3D (ЗША, 2017, 16+, фантастыка, 2 г. 10 мін.), пачатак у 16.30
«Ліга справядлівасці» 3D (ЗША, 2017, 16+, фантастыка, 1 г. 50 мін.), пачатак у 19.00, 21.00

Чацвер, 23 лістапада
«Здароў, тата, Новы год! – 2» 2D (ЗША, 2017, 12+, камедыя, 1 г. 40 мін.), пачатак у 18.00, 20.00
«Ліга справядлівасці» 3D (ЗША, 2017, 16+, фантастыка, 1 г. 50 мін.), пачатак у 22.00

Пятніца, 24 лістапада
«Здароў, тата, Новы год! – 2» 2D, пачатак у 17.00, 19.00
«Ліга справядлівасці» 3D, пачатак у 21.00

Субота, 25 лістапада
«Маленькі вампір» 3D, пачатак у 12.00, 13.30
«Ліга справядлівасці» 3D, пачатак у 17.00, 21.00
«Здароў, тата, Новы год! – 2» 2D, пачатак у 15.00, 19.00

Нядзеля, 26 лістапада
«Маленькі вампір» 3D, пачатак у 12.00, 13.30
«Здароў, тата, Новы год! – 2» 2D, пачатак у 15.00, 17.00
«Ліга справядлівасці» 3D, пачатак у 19.00, 21.00

Здароў, тата, Новы год!

З 23 лістапада ў Слонімскім цэнтры культуры і адпачынку пачнецца паказ новай амерыканскай каляднай камедыі "Здароў, тата, Новы год! — 2".



Фільм ёсць працягам першай часткі фільма, якая выйшла ўзімку 2015 года. Калі фільмы на навагоднюю і калядную тэматыку выходзяць у шырокі пракат, гэта азначае адно — зімовыя святы не за гарамі. Таму пара хаця б праз фільмы пачынаць рыхтавацца да каляднай атмасферы.

Мікіта ПАСТУХОЎ,
n.pastyhow@gmail.com

Капеж


МАЛЮНАК ЯЎГЕНА ІВАНОВА

Красавіцкім адвячоркам Ніна Гуровіч пачула, як на вуліцы гудзіць машына. Выглянула ў акно і ўбачыла, што ля варот суседкі Мані Куліковай нейкія мужчыны выгружаюць будаўнічыя блокі. Абедзве кабеты былі ўдовамі, і ўсе гаспадарчыя клопаты ляжалі на іхніх плячах. Зайздрослівая і сквапная, Ніна проста хварэла, калі суседка што-небудзь купляла ў хату, а тут ні з таго ні з сяго — блокі.

— Што ж гэта яна надумалася рабіць? — прахіліўшы фіранку на акне і пільна ўглядаючыся на вуліцу, думала з пякучай зайздрасцю. Спачатку хацела выйсці і спытаць, але пры чужых людзях не асмелілася. Вырашыла адкласці на заўтра.

— Навошта ты блокі прыперла? — спытала раніцай, як толькі ўбачыла, што Маня тупае па надворку: упраўляецца па гаспадарцы.

— А табе не ўсё роўна? — незалюбіла тая, бо суседка заўсёды ткне нос у яе справы. — Хлеў новы пабудую, бо гэты ўжо і рамантаваць няма як, развальваецца дашчэнту. І сцены гнілыя, і страха. Як толькі ўзнімецца вялікі вецер, то можа знесці яе к чортавай мацеры, яшчэ скаціну падушыць. А так найму людзей, пабудуюць, а потым стары разбяруць, і будзе парадак.

— А дзе ж пабудуюць, раз гэты толькі потым разбяруць?

— Далей ад вуліцы, на самай мяжы з тваім участкам.

— Бачыш, якая спрытная! — бубніла сабе пад нос Ніна, працэджваючы на кухні малако. — І мне трэба было б хлеў перасыпаць, але ўсё рукі не даходзяць, а яна ўзялася і зробіць.

Яе сын Алесь, як і мой Казік, жыве ў Мінску, таксама мае сям`ю і да мацеры рэдка наведваецца. То яна сама... Як ёсць грошы, то і чужыя людзі зробяць, бо сыноў не дачакаешся. То на рабоце яны, то жонкі не пушчаюць, ці яшчэ якая прычына... Нікому мы, старыя, не патрэбны. Толькі як прыедуць зрэдку, то ўсё пазіраюць, каб грошай узяць.

Не мінула і тыдня, як на Маніным пляцы закіпела работа. Будаўнікі з суседняй вёскі шчыравалі з рання да змяркання і неўзабаве ўзвялі хлеў. Накрылі шыферам, уставілі дзверы, словам, усё як трэба. Толькі Ніна прыкмеціла, што будынак паставілі вельмі блізка да яе ўчастка, проста ўпрытык. Ну але што ты скажаш, за мяжу не пералезлі.

Як толькі работа была скончана, палілі дажджы. Ды такія спорныя! Не пераставалі некалькі дзён і начэй. Аднойчы, заганяючы з пашы карову, Ніна ўбачыла, што са страхі суседчынага хлява на яе ўчастак льецца капеж. Такі дружны! Роўным шнурочкам павымываў каменьчыкі, і яны ляжалі нібыта спецыяльна насыпаныя.

Віхор злосці падняўся ў душы з такой сілай, што не магла стрымацца і адразу ж пабегла ў хату да суседкі. Маня якраз варыла вячэру і, убачыўшы Нінін перакошаны твар, застыла з каструляй у руках.

— Здарылася што?! — спытала з трывогай.

— А як жа, здарылася! Нялюдская суседка псуе мой участак сваім капяжом! Ідзі паглядзі, што ты нарабіла! Хіба не магла хлеў паставіць далей ад мяжы, каб мне шкоды не рабіць?!

Маня выцерла аб ручнік рукі і пашыбавала ў двор:

— Дзе тут якая шкода, паказвай?

— Во! Капеж твой размывае зямлю, усе каменьчыкі наверсе! Што хочаш рабі, але каб гэтага не было!

— Калі ўжо так бядуеш, то восенню дам табе які кошык бульбы ці буракоў.

— Не трэба, добранькая такая! Да ўчастковага пайду, няхай ён разбіраецца.

— Ніначка, не будзем смяшыць людзей! Скажы, колькі я табе вінавата, то заплачу.

— Ніякай платы, няхай участковы разбярэцца па законе!

Участковы Андрэй Аўсяны не знайшоў ва ўсім гэтым ніякай крамолы і, пасмяяўшыся са сквапнай Ніны, пайшоў займацца сваімі справамі.

— Усё роўна адпомшчу! Сама, калі ндзе праўды не дабілася, — злосна шаптала Ніна, гледзячы на вымытыя каменьчыкі.

І адпомсціла. Летам, калі ўжо падраслі Маніны кураняты і бегалі ў загарадзе па сваім надворку, неўпрыкмет сыпнула ім атруты, што трымала для мышэй. Назаўтра суседка са слязамі закопвала птушанят, што ўжо ўзяліся ў пер`е. Шэсць штук з дзесяці. Яна здагадалася, што за прычына такога падзяжу, але нікому не сказала: няхай Ніне будзе лягчэй, калі яна так прагне помсты.

Восенню, акурат у капанне бульбы, у Ніны здарыўся гіпертанічны крыз і яе забралі ў бальніцу. Усяго тыдзень і праляжала. Папраўілася, ужо і ўставаць дазволілі дактары, але раптам, ідучы па калідоры, упала. Як ні ратавалі, што ні рабілі — рады не далі...

— От баба, гэтульки нерваў папсавала з-за гэтага капяжу! — сказала другая суседка Віка Нікіпорская. — І вясну, і лета калацілася, а цяпер ужо нічога не патрэбна... Змарнавала сябе без пары...

Праз паўгода пасля пахавання мацеры Нінін сын прадаў сядзібу аднаму бежанцу з Украіны. Жывуць яны з Маняй як добрыя суседзі, і на капеж, з-за якога пайшла на той свет няшчасная кабета, ніхто не зважае...

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

Главный редактор Виктор Владимирович Володащук

Учредитель
Виктор Владимирович ВОЛОДАЩУК

ГАЗЕТА ВЫХОДИТ НА РУССКОМ И БЕЛОРУССКОМ ЯЗЫКАХ

Телефоны редакции:
МТС: 8-029-584-87-32
Velcom: 8-029-133-04-21
факс: 8 (01562) 2-90-00
звонить с 9.00 до **18.00**
Skype — gazslon

Для корреспонденции: 231799, г. Слоним, ул. Красноармейская, д.41
Юридический адрес: г. Слоним, ул. Красноармейская, 41

Регистрационное удостоверение №65 от 05.03.2009 года выдано Министерством информации Республики Беларусь. Свидетельство о госрегистрации УП "Газета Слонимская" ЮКЛ № 001845, выданное Гродненским областным исполнительным комитетом от 03.04.2003 г.

Свободная цена

Тираж номера 3010 экз.

Время подписания к печати по графику 21 ноября 2017 года 15:00

РЕКЛАМНАЯ СЛУЖБА
8-(044) 715-90-03
8-(044) 762-48-39
ул. Красноармейская, 73Б (здание АРЗ)
e-mail: gs@gs.by, gazslon@gmail.com

Объем — два условных печатных листа.
Газета отпечатана в ГОУПП "Гродненская типография", Гродно, ул. Полиграфистов, 4. индекс 230025
Заказ № 5866

Распространяется с газетой "Газета Слонимская" по подписке и в розницу по Республике Беларусь

ISSN 1991-3362



